# Квест-гульня «У пошуках траецкага скарбу»

*Гульня праходзіць на адкрытай пляцоўцы ў парку Перамогі і на “Востраве птушак”. Да квэста дзеці рыхтуюцца загаддзя: вывучаюць разам з выхавальнікамі атрадаў сэнс і значэнне свята Троіца і Сёмуха.*

*Гульню распачынае Гаспадыня Зямля на галоўнай пляцоўцы, дае кароткія тлумачэнні свята, выкарыстоўваючы пытанні да дзяцей, потым раздае атрадам маршруты квэсту, пасля чаго пачынаецца гульня.*

***ВЯДУЧАЯ:*** Добры дзень, паважаныя сябры! Мы рады вітаць усіх вас на нашай гульні “У пошуках траецкага скарбу”. Каб яго знайсці, вам трэба будзе прайсці ўсе выпрабаванні, выканаць усе заданні і толькі потым вы атрымаеце карту, на якой абазначана месца скарбу кожнага атрада.

Што вы ведаееце пра свята Троіца? Адкажыце, як яшчэ інакш у нас называюць гэта свята? (*Дзеці адказваюць*). Так, правільна, інакш яно завецца Сёмуха, таму што святкуецца на сёмы тыдзень пасля Пасхі. У традыцыі свята Троіцы звязаны, першым чынам, з шанаваннем расліннасці, росквіт якой прыходзіцца як раз на гэты час. Знакам свята, галоўным атрыбутам шматлікіх абрадавых дзеянняў была бяроза. На бярозах, якія растуць звычайна "завівалі" галіны, пераплятаючы іх з травой, кветкамі, стужкамі, ручнікамі і г.д. А часам іх абавязкова "развівалі", лічачы, што ў адваротным выпадку дрэва можа "пакрыўдзіцца". У некаторых месцах бярозы ссеквалі, упрыгожвалі, прыбіралі ў дзявоцкае/жаночае адзенне і ўносілі ў селішчы, у хаты, здзяйснялі з імі абыходы засеяных палёў, лугоў, вёсак, хат. Удзельнікі трапез, якія праходзілі да бяроз уладкоўвалі рытуальнае "кармленне" дрэва. Дзяўчыны кумiлiся з бярозай і называлі яе на працягу свята "кумой" і выкарысталі ў варожбах. Часта траецкая бярозка станавілася цэнтрам народнага гуляння Траецкага дня. А што яшчэ дзяўчаты, і нават дарослыя, рабілі з галінак бярозы ў траецкія дні? (*Дзеці адказваюць*). Правільна, рабілі вянкі, прыносілі іх у хату, каб абараніць усіх ад нячыстай сілы і даць ўсім здароўе, а яшчэ вянкі пускалі ў рэчку, ці возера. А што яшчэ ўшаноўвалі нашы продкі ў гэтыя дні? (*Дзеці адказваюць*). Канешне, травы і кветачкі, таму што расліннасць у гэтыя дні набыла сілу і моц.

Дзякую вам за адказы, але пара пачынаць наш квэст. Вас чакаюць розныя, як нядобрыя сілы, так і тыя, якія будуць вам спрыяць. Але вы павінны нічога не баяцца, рухацца толькі згодна вашаму маршруту, і ў вас усе атрымаецца.

*Вядучая раздае атрадам маршрутныя лісты. Пад час гульні дзейнічае атрад “Нячысцікаў”, якія на працягу гульні наладжваюць розныя перашкоды – блытаюць пошукі маршрутаў, застаўляюць выконваць розныя заданні, толькі потым даюць дазвол ісці далей.*

**Маршрутны ліст квэст-гульні "У пошуках траецкага скарбу"**

| № п/п | Маршрут | Штрафныя балы | Колькасць балаў |
|---|---|---|---|
| 1 | **Зямелькіны выпрабаванні** | | |
| 2 | **Забавы Русалкі** | | |
| 3 | **Кацялок Кікімары** | | |
| 4 | **Вадзяніца, не дае вады напіцца** | | |
| 5 | **Да Дзяўчынкі-Зелянінкі** | | |
| | **Агульны лік** | | |

## 1. Зямелькіны выпрабаванні

*На гэтым маршруце дзеці павінны ачысць зямлю ад смецця. Дзяцей сустракае Гаспадыня Зямля і ладзіць з імі гульню.*

***Гаспадыня Зямля:*** Добры дзень, дзеці. Дзякуй, што прыйшлі да мяне. Цяжка мне дыхаць стала, травы мае і кветачкі завялі, звяры і птушкі ўцякаюць з лесу, рыбы - з вадаемаў. Ведаеце чаму? Таму, што нядбайныя людзі выкідваюць рознае смецце, сякуць галінкі дрэў, нават астаўляюць вогнішча ў лесе. А вы таксама так робіце? (*Дзеці адказваюць).* Дык можа мне дапаможаце ачысціць зямельку ад смецця?Тады пачынаем выпрабаванне.

*Праходзіць гульня **"Збяры смецце".** Удзельнікі становяцца ў кола, трымаючыся за рукі. У сярэдзіне кола раскіданы розныя рэчы ("смецце"). Выбіраюцца два ўдзельніка з каманд, якім даецца ў рукі пакет, куды яны будуць збіраць «смецце" з завязанымі вачамі. Дзеці, якія ўтвараюць кола, могуць толькі падказваць словамі, куды рухацца збіральнікам, але не павінны дапамагаць збіраць, за гэта залічваюцца штрафныя балы. Па сігнале вядучай, гульня заканчваецца і падлічваюцца вынікі ў кожнага збіральніка смецця. Гульню можна паўтараць некалькі разоў і кожны раз падлічваць вынікі. Пасля заканчэння выпрабавання дзеці рухаюцца далей у пошуках наступнага маршруту.*

***Гаспадыня Зямля:*** Дзякуй, сябры, што дапамаглі ачасціць зямельку, не кідайце на зямлю ўсё непатрэбнае, шануйце яе, і яна вам заўсёды будзе спрыяць. А цяпер адпраўляйцеся далей.

## 2. Забавы Русалкі

***Русалка:*** Не пабаяліся да мяне прыйсці, я ж у траецкія дні магу вас заказытаць у полі, зацягнуць у багну, ці возера, не баіцеся? (*Дзеці адказваюць).* Ну, тады распачнем маю забаву. Зараз я вас усіх лавіць пачну,

хто пападзецца, той у русалку пераўтворыцца, а хто парушыць правілы гульні, таго багна чакае.

*Русалка праводзіць гульню "**Я Русалкі не баюся".** На пляцоўцы дзвума вяроўкамі абазначаюцца лініі калідора. Русалка становіцца ў цэнтры калідора, спіною да дзяцей, а дзеці з аднога боку ля вяроўкі.Усе разам гавораць наступныя словы: **"Я Русалкі не баюся, чапялой абаранюся"**, пасля чаго ўсе хутка перабягаюць на другі бок калідора, у гэты час Русалка пачынае іх лавіць, каго зловіць, той становіцца Русалкай, і гульня пачынаецца спачатку. Русалка можа лавіць як мага больш дзяцей, якія потым выбываюць з гульні, толькі першы злоўлены – Русалкай.*

***Русалка:*** Добра пагулялі, набегаліся ад Русалкі, але помятайце, што ў "Русальныя нядзелю" самі далёка ад хаты не адыходзьце, ды ў полі і лесе не блукайце, можа здарыцца нешта дрэннае. А цяпер давайце ваш маршрутны ліст, адзнаку ў ім пастаўлю, ды далей адпраўлю, а хто хоча, няхай у мяне застаецца.

### 3. <u>Кацялок Кікімары</u>

***Кікімара:*** *(Хаваецца ад дзяцей на сваёй пляцоўцы, гукае, стукае, грукае па розным прадметам. Дзеці стараюцца прывабіць яе ў цэнтр кола).* Ах, свавольнікі! Злавілі мяне! Ну тады будзем з вамі вось у гэтым кацялку, маю незвычайную страву варыць, ды не простую, а з траў, ды грыбочкаў розных. Я вам буду загадкі загадваць, а вы будзеце хутка адказваць, пакладзём мы гэта ў наш кацялок, ці не.

***Загадкі:***

***1**. Між агуркамі, буракамі, каза з зялёнымі рагамі? (Цыбуля)* ***(Так)***

***2**. Стаіць у лясной глушы, на назе адной, ды ў капелюшы?(Грыб)* ***(Так)***

***3**. Гэта дрэўка бачна здалёку, у яе прыгожае "вароніна вока"?* ***(Не, ядавітая расліна)***

***4.** У чырвоным капялюшы стаяў, ды хтосьці белыя плямы там намаляваў?(Мухамор).* ***(Не)***

***5.** На балоце лясным*
*Між куп'я агніста,*
*Сонейкам жывым*
*Зіхацяць маністы. (Журавіны)* ***(Так)***

***6**. Я на сонейка падобны,*
*Мой ласунак – чорны, дробны…*
*Не тады, калі свячуся,*
*А як згасну і сагнуся. (Сланечнік)* ***(Так)***

***7**. Сок, расу гэтай расліны, не чапай, а то загінеш.*
*Дакранешся, апячэшся, калі ўбачыш, праходзь міма. (Баршчэўнік – ядавітая расліна).* ***(Не)***

***8**. На сцяблінку сонца села,*
*Белы капялюш надзела.*

*У траве ўсміхаецца*
*Дзеткам падабаецца. (Рамонак)* ***(Так)***
**9***. У бледным капялюшыку на тонкай ножцы*
*Расце не ў полі і  не пры дарожцы.*
*Грыб не чапай, ён грыб-падманка,*
*Гэта бледная ...(паганка).* ***(Не)***
**10.** *Жоўтым колерам цвіце,*
*Радуе ўсім вока.*
*Адцвіце – птушынак рой*
*Паляціць далёка. (Дзьмухавец).* ***(Так)***

***Кікімара:*** Вось і добра, разам з вамі вырашылі, што з нашай стравы атрымаецца, смачная, ці не. Калі ўсё правільна паклалі, дык адзнаку добрую атрымалі.

*Кікімара ставіць адзнаку ў маршрутны ліст і адпраўляе дзяцей далей.*

**4. <u>Вадзяніца, не дае вады напіцца</u>**

***Вадзяніца:*** Добры дзень, хлапчукі, ды дзяўчынкі. Што прыйшлі за вадзіцай, каб напіцца. Але яна ў мяне пад замком, каб адкрыць яго, трэба цяжкім шляхам прайсці, ды толькі ўсім разам, адзін за аднаго чапляючыся, ды не губляючыся. Я паміж вашымі спінамі пакладу паветраныя шары, унутры іх ёсць крышачку вадзіцы, вы павінны прайсці паміж дрэвамі, увесь шлях, не згубіўшы шары і не разарваўшы ланцужок.

*Праходзіць гульня* ***"Не згубі вадзіцу".*** *Удзельнікі становяцца у ланцужок, трымаючыся за стан папярэдняга. Вадзяніца кладзе паміж імі паветраныя шары з вадой. Усе разам праходзяць абазначаны шлях, а Вадзяніца абдае іх вадой.*

*На прыканцы падводзяцца вынікі гульні і ставіцца ў маршрутны ліст адзнака.*

**5. <u>Да Дзяўчынкі-Зелянінкі</u>**

*На гэты маршрут прыходзяць усе атрады разам.*

***Дзяўчынка-Зелянінка:*** Праз масток прайшлі і мяне знайшлі, апошняе вам выпрабаванне, выканаеце, ды карту таямнічую атрымаеце, ды клад свой адшукаеце. Свята Троіцы, ці Сёмухі, гэта ўсхваляванне і ўшанаванне расліннасці, усяго таго, што дае нам чыстае паветра. Кожная каманда зараз атрымае ад мяне паштоўку, у якой змешчаны фотаздымкі розных раслін, вы павінны іх правільна назваць і падпісаць кожную, але, заўвага, старайцеся называць на беларускай мове.

Праходзіць гульня, пасля якой усе здаюць Дзяўчынцы-Зелянінцы свае паштоўкі з адказамі.

## <u>Паштоўкі</u>

**1.**



**Васілёк**

**2.**



**Званочак**

**3.**



**Святаяннік (Зверабой)**

**4.**



**Крапіва**

**5.**



**Лён**

**6.**  **Дзьмухавец**

**7.**  **Трыпутнік**

**8.**  **Палын**




***Дзяўчынка-Зелянінка:*** Усе вашы паштоўкі адайце мне, а я вам карту, на якой для кожнага атрада

сваім колерам абазначана месца скарбу. Пакуль вы будзеце шукаць, мы ўсе разам падвядзем вынікі квэст-гульні.

*Пад час пошуку, "нячысцікі" перашкаджаюць дзецям, заблытваючы іх шлях. Пасля таго, як усе атрады знайшлі свае скарбы (можна выкарыстаць салодкія пачастункі, ці розныя прызы і сувеніры), вяртаюцца на тое месца, дзе іх сустракала* ***Дзяўчынка-Зелянінка.*** *Усе вядучыя маршрутаў у гэты час падводзяць вынікі квэст-гульні, і лепшыя атрады ўзнагароджваюцца граматамі і падзякамі.*

***ВЯДУЧАЯ****:* Вялікі дзякуй усім за тое, што нездарма час правялі, добра гулялі, што не ведалі, тое пазналі, а пасля абеду будзеце вянок маляваць і цікава пра яго павінны расказаць. У добры час! Да новых пошукаў!

*Автор: Н. Н. Человенко,*
*культорганизатор*